# Вечны Год родный зямли

Старшыня Быхаўскага райвыканкама Мікалай Кароцін лічыць, што 2009 год даў штуршок не проста для навядзення парадку на роднай зямлі: кожнаму чалавеку варта ўсвядоміць сваю адказнасць за тое, каб на яго зямлі жылося добра і сытна. Пра ўрокі і вынікі Года роднай зямлі на Быхаўшчыне — у інтэрв'ю кіраўніка раёна.

Трэба будавацца.

— Мікалай Мікалаевіч, а што значыць для вас паняцце "родная зямля"?

У мяне яно падзеленае паміж месцам нараджэння і зямлёй, усё свядомае жыццё працую. Я нарадзіўся на Браншчыне.

— Лічыце, памежжа.

— Так, у маёй бабулі ў метрыках так было запісана: горад Старадуб Гомельскай губерніі. Цяпер гэта Расія, але я жыву ў Беларусі, і яна для і мяне — родная зямля. Я вучыўся і выкладаў ў Горацкай акадэміі, ажаніўся з мясцовай беларускай. Працаваў ў камітэце дзяржаўнай маёмасці Магілёўскага аблвыканкама. Тры гады кірую Быхаўскім раёнам. Люблю гэты край і раблю ўсё, каб ён квітнеў.

—Да таго, як прыехалі ў Быхаў, вы, калі шчыра, там давеліся тыповым жыхаром вялікага горада, якому наканавана хадзіць толькі па асфальце.

— Скажу вам, што нягледзячы на складанасці працы і быту ў сельскім раёне, я тут адчуваю сябе душэўна лепей. І прычына не ў тым, што прызвычаіўся, а ў тым, што тут хутчэй можна бачыць канкрэтныя вынікі сваёй працы.

— Што нам трэба зрабіць для роднай зямлі? Каб людзі адчувалі сябе тут спакойна і ўпэўнена. Каб яны хацелі тут жыць, а не чакалі магчымасці з'ехаць. Вось калі я толькі прыехаў у раён і знаёміўся з тэрыторыяй, то мае першае ўражанне было такое — людзі на чамаданах.

— Таму што тут не было ніводнага новага добрага дома. Такога, каб вока радавалася. І каб адразу станавілася зразумелым, што гаспадар пабудаваўся на стагоддзе і пакіне свой дом у спадчыну дзецям. Галоўнае — будаваць. Калі будуецца, значыць душой прыкіпаеш да гэтага месца.

— Ці з'явіліся ў Быхаўскім раёне новыя дамы, якія парадавалі ваша старшынёўскае вока?

— Людзі пачалі будавацца, інтэнсіўна. Яны дастаюць са схованак свае грошы, бяруць крэдыты і будуюць нармальныя дамы. У Быхаве цяпер будуюцца кааператыўныя дамы на 60 і 80 кватэраў. А найбліжэйшымі гадамі ўвядзём новы мікраraён у горадзе. Гэта добра і правільна.

## ПРАДПРЫМАЛЬНІЦКІ РАЙ

— У Год роднай зямлі ў Беларусі найперш рабілі добраўпарадкаванне.

— Так, улады зрабілі на гэта націск, і гэта сапраўды важна. Навядзенне парадку датычыцца не толькі гарадскіх і вясковых вуліцаў, але і лясоў, яроў, дарог. Вываз і ўтылізацыя смецця — таксама важная праблема...

Але мне падаецца, што клопат пра родную зямлю добраўпарадкаваннем не абмяжоўваецца. Трэба, каб мы, тутэйшыя, адчувал сябе абавязанымі сачыць за парадкам на роднай зямлі. Сфарміраваць свядомасць, пачуццё павагі да сваёй зямлі, гордасці за яе. Трэба нагадваць людзям: тваё жыццё ў тваіх руках.

— З падобным дэвізам кіраўніцтву Быхаўскага равна давялося разбірацца з ваенным гарадком, які дастаўся ў спадчыну ад Савацкай Арміі. Памятаю, «Звязда» надрукавала рэпартаж пра пенсіянерку, якая вырашыла адкрыць вытворчасць вешанак. За тым часам была ідэя і паўразбураны вайсковы будынак. Там цяпер растуць грыбы?

— Растуць поўнай хадой. І з'явіліся ўжо новыя планы па пашырэнні справы. Мы дапамагаем усім прадпрымальнікам, якія прыйшлі працаваць. Хоць, вядома ж, мы спазніліся сур'ёзна заняцца вясковай спадчынай.

— Лепей позна, чым ніколі.

— Так, але некаторыя спарахнелыя будынкі давялося разбурыць і ўтылізаваць. А мне гэта крыўдна. Я па натуры такі чалавек, што вельмі не люблю разбураць, а люблю ствараць. У мяне была задача: максімальна раскрыць гэты патэнцыял Быхаўскага раёна.

— Атрымалася зрабіць?

— Прадпрымальнікаў цяпер далёка за 300. Мы максімальна скарысталі магчымасць прадаваць безгаспадарныя будынкі за сімвалічную базавую велічыню. Зразумела, з такога продажу грошы ў бюджэт не пакладзеш, але створаны працоўныя месцы, вырабляецца імпартазамяшчальная прадукцыя, новыя прадпрыемствы плацяць падаткі. Па паступленні ў бюджэт ад прыватнага бізнэсу наш раён займае другое месца ў вобласці. За два гады створаны больш за 600 новых працоўных месцаў.

Сёлета добра сталі развівацца прадпрыемствы, якія працуюць з дрэвам. Прыходзіць да нас і сур'ёзны бізнэс. Прадпрыемотва «Бетонкомплекс» увезла ў раён два сучасныя перасоўныя бетонныя заводы — а гэта 600 тысяч еўра інвестыцый. Гэта ў дадатак да нашых двух гігантаў: «Агралінк» займаецца птушкай, а мясныя вырабы «Белатміга» ведае ўся краіна. На апошнім прадпрыемстве — 600 чалавек. Яны працуюць на родную зямлю.

## АГРАТУРЫСТЫЧНАЯ ВЁСКА

— Калі з боку Магілёва пад'язджаеш да Быхава — аж дух захоплівае ад прыгажосці. Днепр, заліўныя лугі,а на пагорку—старажытны замак...

— Быхаўскі раён — адзін з самых прыгожых. Магу сказаць гэта з упэўненасцю, бо аб'ездзіў кожны куток Магілёўшчыны. Разліў на Дняпры ў нас называюць “Венецыяй”.

— Гэта сведчыць аб вялікім турыстычным патэнцыяле. Нездарма Быхаўскі раён цяпер займае ў вобласці паршае месца па колькасці аграэкасядзібаў.

— У нас іх ужо 17. Тры гады таму не было ніводнай. Прычым ёсць нават экстрэмальны турызм: людзі сплаўляюцца па Друці і Дняпры.

— Вы паспрабавалі?

— Шчыра кажучы, не хапае часу на адпачынак. Аднак кажуць, што гэта незабыўные ўражанні. Мы свае аб'екты аграэкатурызму настройваем на высокі ўзровень абслугоўвання, гасцінны прыём, душэўнае стаўленне да людзей. Дапамагаем гаспадарам аграсядзібаў — з атрыманнем крэдытаў, з гарантыямі пад іх. Яны добрую справу робяць: турбуюцца, каб навокал чыста было, каб агароджу не ламалі, каб сцежка была акуратная. Так фарміруецца новы менталітэт чалавека на сваёй зямлі.

— Як будза развівацца любімае, але ўсё яшчэ не самае камфортнае месца адпачынку магілёўцаў — Чыгірынскае вадасховішча?

— У нас вялікія планы. Там ёсць вёска Грудзічыма, якая, відаць, будзе агратурыстычнай. Пясчаны пляж на беразе і новыя сядзібы: адразу 7 чалавек вырашылі прымаць турыстаў. Хлопцы мяркуюць зрабіць нешта накшталт Дудутак. Будзе і на нашай роднай зямлі такое адметнае месца.

— У вас яно будзе не адно. Раскажыце, што будзе ў Баркапабаве, знаковым для ўсёй Беларусі. Там быў створаны ў старажытнасці знакаміты Баркалабаўскі летапіс.

— Мы цяпер дапамагаем аднаўляць праваслаўны жаночы манастыр. Там ідзе будоўля. Людзі грошы даюць, супрацоўнікі арганізацый прыязджаюць дапамагаць на будоўлю.

— Мяркую, што гэта месца прыцягне шмат турыстаў. Баркапабава будзе цалкам даступным. Там у аграгарадку, дарэчы, з'явіліся і прадпрымальнікі: хутка запрацуе вытворчасць кандытарскіх вырабаў.

## СТАРАЖЫТНЫЯ ПОМНІКІ

— Цяпер пра старажытны замак на ўзгорку. Ён быў пабудаваны напачатку XVII стагоддзя пры Льву Сапегу. Вядомасць непрыступнай цытаделі прынёс Быхаву менавіта гэты абарончы замак.

— Гэта мой боль. Таму што грошы на яго аднаўленне патрабуюцца вялізныя, а нам выпадае як мінімум навесці парадак. За савецкім часам там была вытворчасць мэблі...

— Потым, памятаю, яго ўзяў у арэнду прадпрымальнік, які меў прозвішча Сапега. У яго былі вялікія планы, але іх разбурыў, разам з часткай замка пажар. Што вы мяркуеце зрабіць там цяпер?

— Для нас гэты аб'ект непад'ёмны: калі б знайшоўся прыватны інвестар — я пайшоў бы насустрач. Але ў такой сітуацыі мы мяркуем проста пачысціць замак і тэрыторыю навокал. Ведаеце, і цяпер часам там ходзяць людзі, глядзяць. Яны тлумачаць, што старыя руіны прыцягваюць болей за адрэстаўраваныя сучасным чынам помнікі архітэктуры.

— Я згодна з такой высновай: да сапраўднай старажытнасці заўсёды хочацца дакрануцца.

— Вось мы і мяркуем пакуль пакінуць

замак маляўнічымі старажытнымі руінамі. А вось сядзібу графа Талстога ў Грудзінаўцы дзяржава павінна аднавіць. Там не самыя вялікія выдаткі, і палац з паркам можна талкова выкарыстоўваць, нават падтурызм.

— А сінагога сярэдзіны XVII стагоддзя ў цэнтры горада? Няўжо няма каму аднавіць гэты помнік архітэкгуры і гісторыі?

— Існуе шмат спецыфічных праблем, каб зноў зрабіць там сінагогу. Мы вырашылі зрабіць замест яе ўрачыстую залу, карцінную галерэю. Побач ёсць 100-гадовы дом, дзе размесціцца музей. Гэта будзе адзіным выставачным комплексам.

У наступным годзе Быхаву спаўняецца 640 гадоў, да юбілею трэба ліквідаваць усю разруху.

**ІНШАЙ ЗЯМЛІ НЕ БУДЗЕ**

— Калі падводзіць вынікі Года родмай зямлі, то ці стала лепей?

— Стала лепей, таму што да нас прыязджаюць маладыя людзі ў пошуках працы і добрага жыцця. Новыя прадпрыемствы, новыя магчымасці, камфортчыя ўмовы.

Мне падаецца, што моладзь прывучаецца цаніць тое, што ёсць на роднай зямлі, і падтрымліваць гэта, захоўваць. Раней маладыя людзі ўсе новыя ліхтары разбівалі, цяпер шукаюць сметніцу на вуліцы для паперкі.

— Значыць, Год роднай зямлі павінен быць вечным?

— Такое стаўленне да роднай зямлі павінна быць нормай. Іншай зямлі ў нас не будзе. Таму не будзем да яе абыякавымі.

***М.Каротин***

**Источник:** Звязда.-2009.-12 снеж.-С.3.